# ПРАБАЧАНЫЯ БОГАМ

GOSPEL 316

***«Шчасьлівы, каму дараваная правіна, каму пакрыты грэх!»*** **Псалтыр 32:1**

Няправільныя рэчы, якія мы робім (Біблія называе іх грахамі), аддзяляюць нас ад Бога. Нам трэба, каб Бог нас прабачыў, каб з'яднацца з Богам, … каб прыгатавацца да вечнасці. Біблейнае прабачэнне не азначае, што Бог кажа, што Ён не заўважыў гэтыя грахі, і адмёў вечнае пакаранне за іх. Не, гэтае пакаранне ці «штраф», мае быць сплачана. Добрая навіна (Евангелле) у тым, што Ісус [бязгрэшны Бога-Чалавек] сплаціў гэтае пакаранне за вас сваёй крывёю, памёршы на Крыжы. Ў пэўным сэнсе, Ён заняў вашае месца. Ісус ахвяраваў Сябе замест вас. Але гэтага недастаткова. Гэтая плата мае стаць вашай, мае быць залічаная на ваш рахунак. Узнікае важнае пытанне – як жа гэта адбываецца? Гэта стаецца, калі вы раскайваецеся (адварочваецеся ад вашых грахоў і паварочваецеся да Бога) і верыце ў Ісуса. І тады, і толькі тады, Бог прабачае вас.

## *НАШАЯ ПРАБЛЕМА ... АДДЗЯЛЕННЕ*

*«бо ўсе зграшылі і пазбаўлены славы Божае …»* Рымлянаў 3:23

*«Бо беззаконьні вашыя аддзялілі вас ад Бога вашага, і грахі вашыя схавалі аблічча Ягонае ад вас, каб Ён [вас] ня чуў.»* Ісая 59:2

*«… Які ў полымі агню зьдзяйсьняе помсту над тымі, што ня ведаюць Бога і не паслухмяныя Эвангельлю Госпада нашага Ісуса Хрыста. Яны атрымаюць прысуд – вечнае зьнішчэньне, ад аблічча Госпада і ад славы магутнасьці Яго.»* 2 Фесалонікійцаў 1:8-9

*«Бо плата за грэх – сьмерць, а дар [ласкі] Божай – жыцьцё вечнае ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым.»* Рымлянаў 6:23

*«Бо Хрыстос, калі мы былі яшчэ слабымі, у вызначаны час памёр за бязбожных.»* Рымлянаў 5:6

## *ВЫРАШЭННЕ АД БОГА ... ЗАМЯШЧЭННЕ*

*«Бо так палюбіў Бог сьвет, што Сына Свайго Адзінароднага аддаў, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыцьцё вечнае.»* Яна 3:16

*«Любоў у тым, што не мы палюбілі Бога, але што Ён палюбіў нас ды паслаў Сына Свайго ў уміласціўленне* [дастатковую ахвяру] *за нашы грахі.»* 1 Яна 4:10 (ББЧ)

*«А Бог Сваю любоў да нас даводзіць тым, што Хрыстос памёр за нас, калі мы былі* [яшчэ] *грэшнікамі.»* Рымлянаў 5:8

*«Ён грахі нашыя Сам узьнёс у целе Сваім на дрэва, каб мы, памёршы дзеля грахоў, жылі ў праведнасьці…»* 1 Пятра 2:24

*«А тым, што прынялі Яго* [Ісуса], *дало Яно ім уладу дзецьмі Божымі стаца, тым, якія вераць у імя Яго…»* Яна 1:12

## *ВАШ ШЛЯХ ДА ПРАБАЧЭННЯ ... ПАВЕРЫЦЬ У ІСУСА*

*«Пра Яго* [Ісуса] *ўсе прарокі сьведчаць, што ўсякі, хто верыць у Яго, атрымае адпушчэньне грахоў праз імя Ягонае,»* Дзеі 10:43. *«Бо ласкаю* [Божай] *вы збаўленыя праз веру; і гэта не ад вас – Божы дар: не праз учынкі, каб ніхто не хваліўся …»* Эфэсцаў 2:8-9. Вы можаце паверыць у Ісуса (а не проста думаць пра Ісуса) праз раскаянне … гэта значыць, павярнуўшыся да Хрыста вераю. Малітва ніжэй дае вам магчымасць гэта зрабіць. Гэта не клятва ці заклінанне. Памаліцеся, калі вашае сэрца сапраўды шчыра гэтага жадае.

**Дарагі Божа,**
**Я прызнаю маю патрэбу ў Табе ... Я грэшны чалавек.**
**Я каюся ... я адварочваюся ад маіх грахоў да Цябе.**
**Я веру ў Ісуса … што Ён, будучы Богам, памёр за мяне на крыжы.**
**Я запрашаю Яго быць маім Збаўцам.**
**Амін**

Ісус заплаціў пакаранне за вашы грахі. І праз веру ў Ісуса, унесеная Ім плата робіцца вашай. Бог прабачыў вас. І Ісус сказаў, што вы ў бяспецы на ўсю вечнасць, Яна 3:16.

***«Шчасьлівы, каму дараваная правіна, каму пакрыты грэх.»*** **Псалтыр 32:1**

Бясплатныя PDF-брашуры *«Прабачаныя Богам»* на розных мовах даступныя на сайце Gospel316.org.

**Калі вы шчыра памаліліся гэтай малітвай,** вы прабачаныя Богам, і вы будзеце ў бяспецы з Ім на ўсю вечнасць. Самаахвярная смерць Ісуса дала вам гэтае прабачэнне. Бог паабяцаў, што вечнае жыццё можа належаць вам ужо зараз … што вы не пойдзеце на суд … і што вы перайшлі ад смерці ў жыццё, Яна 5:24. Вы ў бяспецы, таму што ніхто не можа выхапіць вас з Яго ўсёмагутнай рукі. Гэта Ён трымае вас, а не вы трымаецеся за Яго. Ісус сказаў: *«І Я даю ім жыцьцё вечнае, і не загінуць на вякі, і ніхто ня выхапіць іх з рукі Маёй. Айцец Мой, Які даў Мне іх, большы за ўсіх, і ніхто ня можа выхапіць іх з рукі Айца Майго,»* Яна 10:28-29.

**Калі вы не гатовыя прамовіць гэту малітву,** няхай яна стане для вас найвышэйшым прыярытэтам. Ваша рашэнне будзе мець вечную значнасць, і наступствы таксама будуць вечныя. Па той бок жыцця ў вас не будзе іншага шанцу. *«І як усім людзям вызначана раз памерці, а пасьля гэтага – суд,»* Габрэяў 9:27. Калі вы маеце пытанні, якія перашкаджаюць вам прыняць рашэнне, паразмаўляйце з асобай, якая дала вам гэты буклет.

## Ілюстрацыі і вызначэнні

**Прабачэнне.**
Прабачэнне. Біблейскае прабачэнне патрабуе сплаты пакарання за грэх. Пакаранне за грэх – гэта вечнае аддзяленне ад Бога. Біблейскае прабачэнне – гэта перанос на Ісуса вашага граху і кары за яго. Бог перадаў наш грэх і пакаранне за яго бязгрэшнаму Ісусу. І тады Бог даў нам узамен Яго праведнасць. Выглядае, нібы на Небе ёсць дзве кнігі. У першай кнізе, вашым дасье, ёсць пазнака пра кожную няправільную рэч, якую вы некалі зрабілі. Старонкі гэтай кнігі наскрозь пакрытыя пазнакамі. Біблія ясна сцвярджае, што грахом ёсць некаторыя рэчы, якія мы робім (грахі здзяйснення) і некаторыя рэчы, якія мы не робім (грахі бяздзейнасці). Некаторыя думкі таксама могуць быць грахом. Тры грахі ў дзень, гэта 1000 за год. На працягу жыцця ў нас накопіцца вельмі шмат грахоў. Іншая кніга – гэта дасье на бязгрэшнага Ісуса. Яе старонкі чыстыя і бездакорныя. Калі вы верыце ў Ісуса, вокладкі гэтых дзвюх кніг нібы мяняюцца месцамі. І тады дасье з вашым імем будзе абсалютна чыстым, ваш грэх і пакаранне за яго знікнуць.

**Сапраўднае вырашэнне.**
Ісус сказаў, *«Я ёсьць шлях, і праўда, і жыцьцё. Ніхто не прыходзіць да Айца, калі не праз Мяне,»* Яна 14:6. Нашая галоўная праблема – аддзяленне ад Бога па прычыне граху; і Біблія прапануе ўнікальнае вырашэнне для яе. Іншыя рэлігіі патрабуюць, каб мы сустрэлі вечнасць з нашымі грахамі ў надзеі, што бог іх не заўважыць. Ісус унікальны тым, якім чынам Ён прабачае нашыя грахі – Ён змывае іх цалкам. Калі нашыя грахі сцёртыя, бо яны перайшлі на Ісуса, мы можам сустрэцца з Богам і вечнасцю. Апостал Пётар кажа: *«… і ні ў кім іншым няма збаўленьня, бо няма іншага імя пад небам, дадзенага людзям, у якім мусілі мы быць збаўленыя,»* Дзеі 4:12. Апостал Павел піша: *«Бо адзін Бог і адзін Пасярэднік паміж Богам і людзьмі – Чалавек Хрыстос Ісус, Які аддаў Сябе на адкупленьне за ўсіх, як сьведчаньне ў свой час,»* 1 Цімафея 2:5-6. Толькі ў Ісусе мы маем сапраўднае вырашэнне.

**Вера ў Ісуса.**
Верыць у Ісуса – гэта нешта большае, чым *думаць пра* Ісуса. Уявіце, што вы ляціце ў самалёце высока над гарамі, калі раптам рухавікі пачынаюць тарахцець і глухнуць. Самалёт катастрафічна губляе вышыню. Пілот просіць усіх прышпіліць парашуты і пакінуць самалёт праз адчыненыя дзверы. Вы ведаеце пра парашуты. Вы бачылі іх па тэлевізары. Але цяпер усё інакш. Выйсце з гэтага самалёта праз адчыненыя дзверы патрабуе нечага большага, чым проста *думаць пра* парашут … яно патрабуе *веры ў* парашут. Замест парашута не спрацуе нейкі турыстычны заплечнік. Каб выжыць, вам патрэбны правільны парашут … выйсце без яго – гарантаваная смерць. Выйсце з парашутам – гэта 100% адданасць веры. Вы можаце сумнявацца ... але выжыванне патрабуе цалкам даверыцца парашуту. Ісус – адзіны сапраўдны вечны парашут. Выходзьце, давяраючы Яму. Верце ў Яго!

**Інструкцыя для друку.** Рэкамендуецца друкаваць на адной старонцы з дзвух бакоў. Друкуйце ў каляровым ці ў чорна-белым выкананні.

---

*Прабачаныя Богам* © 2024 апублікавана служэннем Acts One Eight, узята з www.Gospel316.org. Вы можаце свабодна друкаваць, капіраваць, публікаваць і дасылаць як паведамленне пры ўмове захавання нязменнасці гэтай заявы. Але вы можаце дадаць да матэрыялу назву сваёй царквы або служэння і/ці лагатып. Acts One Eight базуюцца выключна на Бібліі. Мы існуем, каб дапамагаць людзям прыходзіць да веры ў Ісуса Хрыста і тады вырастаць, каб зрабіцца Яго вучнямі. Пераклад для не-англамоўных версій выкананы www.ChristianLingua.com. Біблейныя цытаты ў арыгінальнай англійскай версіі ўзятыя з New American Standard Bible (NASB). Біблейныя цытаты ў дадзенай версіі ўзятыя з Бібліі Антонія Бокуна (БББ), калі не пазначана іншае.